Практыкаванне 253.

— Прачытайце і адгадайце загадкі. (Вучні па чарзе чытаюць загадкі, называюць словы-адгадкі *рака, туман.*) Якія дзеясловы дапамаглі вам знайсці адгадкі? Спішыце загадкі, раскрываючы дужкі. Вызначыце час і лік дзеясловаў. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

Практыкаванне 254.

— Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся хутка і правільна вымаўляць яе. (Некалькі вучняў расказваюць скорагаворку.) Запішыце скорагаворку па памяці. Знайдзіце ў ёй дзеясловы прошлага часу. Вызначыце іх лік і род. (Пасля самастойнага выканання задання вучнямі праводзіцца ўзаемаправерка напісанага.)

Развіццё маўлення.

— Прыдумайце падобную скорагаворку, замяніўшы слова *зебра* на слова *заяц*. Як змяніліся дзеясловы ў ёй? *(Змянілася форма роду дзеясловаў.)*

**III. Падвядзенне вынікаў урока.**

— З якімі часцінамі мовы пазнаёміліся ў трэцім класе? Што такое назоўнік (прыметнік, дзеяслоў)? Як змяняюцца назоўнікі (прыметнікі, дзеясловы)? Для чаго служаць у сказе прыназоўнікі?

**Крыніцы ілюстрацый:** http://stroysezon.ru/upload/iblock/25f/25f70bc61681d677647e280a7ab0daee.jpg; http://sagatheball.ru/wp-content/uploads/2012/04/tennis-ball-no-logo1-517x300.jpg; https://publicdomainvectors.org/photos/egore911_basketball.png; https://encrypted-tbn0.gstatic.com/images?q=tbn:ANd9GcQS7vEMfXXJ0F7NNBjFx_-IByUwcv0ox2USlfUwo77Y9JEGMdP.

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*

# Практыканні са слоўнікавымі словамі*

***Адцвітаць.***

*1. Расшыфруйце слоўнікавае слова і запішыце яго.*

| 6 | 2 | 4 | 7 | 3 | 5 | 1 | 9 | 8 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| т | д | в | а | ц | і | а | ь | ц |

*2. Прачытайце аднакаранёвыя словы. Выдзеліце ў іх корань і прыстаўку.*

адцвітаць — зацвітаць — дацвітаць

*3. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

Дрэвы пачалі ______ . Пялёсткі кветак асыпаюцца.

*4. Прачытайце верш. Для чаго людзі вырошчваюць грэчку?*

Грэчка

Жаданы госць
Яна заўсёды
На палетках нашых.
Зацвіце —
Адорыць мёдам.
А..цвіце —
Блінамі, кашай. *(М. Пазнякоў* [1, с. 191]*)*

Палетак — участак поля, які выкарыстоўваецца пад пасевы.

*Устаўце ў слова прапушчаную літару.*

*Знайдзіце ў вершы антонімы. Запішыце гэтыя словы. Абазначце ў іх прыстаўку.*

*5. Прачытайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.*

Пойдзе дож.. —
І над праспектам
Ра..цв..таюць
Розным кветам.
Варта сонейку заззяць —
І зусім іх не відаць. *(М. Пазнякоў* [1, с. 91–92]*)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| п | с | р | н |
| а | о | а | ы |

*Устаўце ў словы прапушчаныя літары.*

*Знайдзіце і падкрэсліце ў загадцы аднакаранёвае слова да слоўнікавага слова* ***адцвітаць.***

***Смяяцца.***

*1. Разгадайце рэбус. Запішыце слоўнікавае слова.*

**смя** ”  **ца** ______

*Абазначце націск у слоўнікавым слове. Падкрэсліце першы склад перад націскам.*

*2. Падбярыце і запішыце супрацьлеглае па значэнні слова да прапанаванага.*

плакаць — ______________

*3. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

Петрык любіць ______________ з жартаў дзядулі.

*4. Дапоўніце ўстойлівыя выразы слоўнікавым словам.*

______________ ў бараду

| смяяцца ціха, непрыкметна | хтосьці робіць штосьці недарэчнае, вартае насмешкі |
|---|---|

куры будуць ______________

*Злучыце кожны выраз з яго значэннем.*

*5. Дапішыце слоўнікавае слова ва ўстойлівыя выразы.*

______________ ў бараду

______________ ў рукаў

куры будуць ______________

*Злучыце паміж сабой блізкія па значэнні выразы.*

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай ўкладцы.

*6. Прачытайце скорагаворку. Устаўце ў словы патрэбныя літары.*

Ехаў да сяброў Алег,
Вёз з сабою смеху мех.
У м..ху смех рассм..яўся,
І ад смеху мех парваўся. *(М. Пазнякоў* [1, с. 76]*)*

*Выпішыце са скорагаворкі аднакаранёвыя словы. Укажыце, якой часцінай мовы яны з'яўляюцца.*

*7. Утварыце новыя словы ад слова* **смяяцца** *пры дапамозе прыставак за-, рас-, па-.*

*Сярод запісаных слоў знайдзіце сінонімы, падкрэсліце іх.*

***Восеньскі.***

*1. Закрэсліце літару, якая сустракаецца часцей за астатнія.*

ВАОАСАЕАНАЬАСАКАІ

*Запішыце слова, якое атрымалася. Пастаўце ў ім націск.*

*2. Знайдзіце і абвядзіце слова, якое «схавалася» ў слоўнікавым слове.*

ВОСЕНЬСКІ

*Дапоўніце гэтым словам прыказкі. Растлумачце сэнс кожнай прыказкі.*

__________ — на дзень пагод восем.

Вясна кветкамі багата, а __________ з пірагамі ў хату.

*3. Падбярыце і запішыце блізкае па значэнні слова да прапанаванага.*

асенні — __________

*4. Прачытайце сказ.*

Цёплым **асеннім** днём дзеці прыйшлі ў парк.

*Замяніце выдзеленае слова блізкім па значэнні слоўнікавым словам. Запішыце сказ, які ў вас атрымаўся.*

*5. Прачытайце верш.*

__________

Санкі, лыжы і канькі
лічаць восені дзянькі.
Сніца ім сняжок іскрысты,
сніцца ім лядок празрысты.
А ў дзяцей якія сны?
— Тое ж бачаць і яны. *(Н. Галіноўская* [2, с. 77]*)*

*Які загаловак найбольш падыходзіць да яго: «Зімнія сны», «Восеньскія сны», «Летнія сны»? Запішыце загаловак верша.*

*6. Якія літары «збеглі» са слова? Злучыце іх з месцам пропуску ў слове.*

[о] [во]

[..]сеньскі

*Запішыце слоўнікавае слова, падзяляючы яго для пераносу рознымі спосабамі.*

***Сшытак.***

*1. Разгадайце рэбус. Запішыце слоўнікавае слова.*

Н = Т

С  К __________

*2. Дапоўніце сказы слоўнікавым словам. Пастаўце ў канцы сказаў патрэбныя знакі прыпынку.*

Мама купіла сыну прыгожы __________

Які __________ трэба падрыхтаваць да ўрока

*3. Прачытайце верш. Дапоўніце яго патрэбным слоўнікавым словам. З чым аўтар верша параўноўвае качан? Чаму?*

Качан

Круглы ён,
Нібыта мячык.
Ёсць нага,
Але не скача.

Шмат лістоў,



Але не __________,
Апрануў
Паўсотні світак. *(М. Пазнякоў* [1, с. 159]*)*

Світка — доўгая сялянская верхняя вопратка з сукна.

*У слоўнікавым слове падкрэсліце літары, якія абазначаюць галосныя гукі.*

*4. Прачытайце верш. Дапішыце патрэбную літару ў слоўнікавае слова.*

Я не забуду ніколі
Сш..ткі, пеналы, буквар,
Першыя радасці ў школе,
Першай настаўніцы твар. *(Сяргей Грахоўскі* [3]*)*

*Падзяліце слоўнікавае слова на склады вертыкальнай лініяй.*

*5. З асобных слоў складзіце сказ. Які ён па мэце выказвання?*

падручнікі, вокладкі, вучні, сшыткі, у, абгарнулі, і

*Запішыце сказ пад дыктоўку настаўніка, правільна афарміце яго на пісьме.*

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.
2. *Галіноўская, Н. В.* Клубок і калабок / Н. В. Галіноўская. — Мінск : Юнацтва, 1999. — 158 с.
3. Вясёлка. — 2009. — № 10. — С. 2.

**Крыніцы ілюстрацый:** https://dc602r66yb2n9.cloudfront.net/pub/web/images/content_images/hakka80/teemat/voittoisat_vuosikymmenet/kelirengas_nosto.jpg?c=system_640x; http://catalog.grt.ru/160252-thickbox_default/485c112533.jpg

***Свірыдзенка В. І.***, *кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.***, *кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*